# АБАГУЛЬНЕННЕ І СІСТЭМАТЫЗАЦЫЯ ВЕДАЎ ПА ТЭМЕ "ДЗЕЯСЛОЎ"



**Ільінова Таццяна Юр'еўна,**
*настаўнік беларускай мовы і літаратуры 1-й кваліфікацыйнай катэгорыі ДУА "Ноўкінская сярэдняя школа Віцебскага раёна"*

*У артыкуле прадстаўлены план-канспект урока ў 6-м класе па абагульненні і сістэматызацыі ведаў.*

Репозиторий ВГУ

Мэта: паглыбіць, замацаваць, абагуліць веды па асноўных пытаннях тэмы. Удасканаліць уменні адрозніваць разнастайныя граматычныя катэгорыі, групы дзеясловаў. Развіваць звязную мову, памяць і мысленне. Спрыяць выхаванню любові і пашаны да роднай мовы і роднага краю.

Тып урока: урок-абагульненне.

Абсталяванне: карткі з заданнямі, малюнкі, мультымедыйная прэзентацыя, відэа-праектар, экран.

Ход урока

**I. Арганізацыйны момант.**

**II. Паведамленне тэмы і мэты ўрока.**

Праца з эпіграфам:

*І чым ты так вабіш, не знаю.*
*Нябёсаў бяздонная сінь,*
*За казачныя небакраі*
*Ў нязведаную далячынь!*
*Няўжо я, дзівак, спадзяюся*
*Другую радзіму адкрыць,*
*Як быццам бы без Беларусі*
*Змагу я і дыхаць і жыць.*

Максім Танк

- Пералічыце, якія часціны мовы сустракаюцца ў дадзеным тэксце?
- А якую часціну мовы мы скончылі вывучаць?
- Аб чым гэты тэкст?
- Як вы думаеце, якая мэта нашага ўрока?

(Дзеці выказваюць свае думкі, пасля чаго настаўнік паведамляе свае мэты.)

**III. Замацаванне пройдзенага матэрыялу.**

1. Творчы дыктант.

Ад дадзеных назоўнікаў утварыце дзеясловы:

Разуменне – разумець
Побыт – пабываць
Любоў – любіць
Зразуменне – зразумець
Лёт (палёт) – ляцець
Вядзенне – прывесці
Покліч – клікаць
Замена – замяніць

• Якія дзеяслоўныя формы ў вас атрымаліся?

2. Пазнайце верш, прыгадайце аўтара і ўстаўце дзеясловы, якія ў вас атрымаліся ў папярэднім заданні:

Каб … Беларусь нашу мілую
Трэба ў розных краях … .
… цяпер, чаму з выраю
Жураўлі на Палессе … .
Што ім тыя пагоды паўднёвыя!
Што ім пышны платанавы рай,
Калі … іх далі сасновыя
І азёрны рабінавы край
Сакавітыя пожні мурожныя
Не … нічым і нідзе
І зямлю, дзе сцяжыначка кожная
У прыветлівы бор … .
Каб … Беларусь нашу мілую,
Трэба ў розных краях … .
… тады, чаму з выраю
Жураўлі на Палессе … .

Алесь Ставер "Жураўлі на Палессе ляцяць")

Пасля таго як вучні прачыталі верш, пажадана ўключыць песню на гэтыя словы.

3. Праца з тэкстам.

• Складзіце тэкст з прапанаваных сказаў.

• Устаўце патрэбныя дзеясловы.

• Растлумачце выбар устаўленых літар.

• Вызначце, да якога стылю належыць тэкст. Чаму?

• Які тып гэтага тэксту?

Мы з братам … дадому вож(ы,і)ка. Так ён стаў … у нас. Днём … ў куточак пад ла(у,ў)ку. Ноччу … па ха(т,ц)е. Аднойчы мы прыйшлі на кухню і … . Вож(ы,і)к … на сваіх каро(ц,т)енькіх но(ш,ж)ках і … . Ён не мог … ў мыш(ы,і)ную норку за плітой. Таму і … .

З часам вож(ы,і)к … сваім у нашай сям(‘,ь)і. Яго кармілі і … . А потым ён пачаў … мыш(е,э)й. І мы … яго Санітарам.

Для даведак: стаў, лавіць, даглядалі, празвалі, жыць, тупаў, прынеслі, здзівіліся, забіваўся, стаяў, пралезці, фыркаў, злаваўся.

**IV. Фізкультхвілінка.**

**V. Кантроль і ацэнка ведаў.**

Праца з тэстам.

1. Вылучыце групу, у якой аб'яднаны рознаспрагальныя дзеясловы:

а) чытаем, вучыш, мыешся;

б) есці, бегчы, даць;

в) збірай, адбываецца, забываць.

2. Знайдзіце ў кожнай групе «чацвёрты лішні» дзеяслоў:

а) сядзіць, глядзець, расказваць, касіць;

б) узнімалі, берагу, бяру, расказваю;

в) мыцца, чытаць, купацца, стрыгчыся;

г) узяў, разгледзеў, пазначыў, грукаў.

3. Замяніце фразеалагізмы дзеясловамі-сінонімамі:

а) даць драпака;

б) кляваць носам;

в) гнуць спіну;

г) навастрыць вушы.

4. Перакладзіце на беларускую мову:

а) пойти за водой;

б) простить меня;

в) смеяться над другом;

г) жениться на Алёне.

**VI. Падвядзенне вынікаў.**

Праца з кластарам.

Вучням на кожную групу раздаецца рамонак. На кожным пялёстку яны павінны запісаць лексіка-граматычны разрад дзеяслова. Потым вучні цягнуць загадзя падрыхтаваныя пялёсткі, пішуць на іх граматычную катэгорыю і ствараюць рамонак на дошцы. Калі вучань выходзіць да дошкі, каб злучыць пялёстак з сярэдзінай, ён расказвае пра гэту катэгорыю дзеяслова.

(Сярэдзіна рамонка загадзя прымацавана да дошкі.)

**VII. Рэфлексія**

Вучням раздадзены карткі, дзе яны самі ацэньваюць сваю працу на ўроку.

• Слова настаўніка:

– Сёння мы з вамі ўзнавілі свае веды па тэме "Дзеяслоў". Спадзяюся, што і ў будучым вы будзеце падыходзіць да набыцця ведаў творча, старацца пазнаваць новае, бо веды – гэта гарантыя вашай будучыні.

Скончыць урок хочацца словамі Амара Хаяма:

Тое, што мы ведаем, – абмежавана.

Тое, чаго не ведаем, – бясконцае.

**VIII. Дамашняе заданне.**

Паўтарыць § 54–71, падыхтавацца да выніковай работы.

Рэпазіторый ВДУ